УДК 94(476)“1921/1939”

# УПЛЫЎ АСАЦЫЯЛЬНЫХ З’ЯЎ НА МОЛАДЗЬ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ І БАРАЦЬБА З ІМ (1921–1939 гг.)

***В. В. Даніловіч***
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі

*Артыкул прысвечаны даследаванню праблемы ўплыву асацыяльных з’яў на моладзь Савецкай Беларусі ў 20–30-я гг. XX ст., а таксама барацьбы дзяржавы і грамадства з гэтым уплывам. Сцвярджаецца, што дзяржава выкарыстоўвала комплекс практычных і прафілактычных мер для змяншэння асацыяльных з’яў сярод юнага пакалення, ад якіх не быў пазбаўлены і камсамол Савецкай Беларусі. Юнакі і дзяўчыны таксама ўдзельнічалі ў барацьбе з асацыяльнымі з’явамі. Гэта дзейнасць моладзі з 1932 г. атрымала ў БССР шырокі размах. Увогуле асацыяльныя з’явы сярод камсамольцаў і юнацтва значна зменшыліся ў 1930-я гг., калі было ліквідавана беспрацоўе, у дзяржавы з’явіліся дадатковыя матэрыяльныя сродкі для падтрымкі маладога пакалення, а заканадаўства стала больш строгім.*

**Ключавыя словы:** Савецкая Беларусь, моладзь, асацыяльныя з’явы, палітыка кампартыя, дзейнасць камсамола.

Цяжкае сацыяльна-эканамічнае становішча, у якім апынулася Савецкая Беларусь у выніку рэвалюцыйных і ваенных падзей, спрыяла распаўсюджанню асацыяльных з’яў у грамадстве. Зразумела, што гэтыя з’явы ў пешую чаргу ўплывалі на маладое пакаленне.

Найбольш актуальнай праблемай у гэты час з’яўлялася дзіцячая і падлеткавая беспрытульнасць. Менавіта таму камсамольцы былі задзейнічаны ў кантролі за становішчам дзяцей, выяўленні безнаглядніка (да гэтай справы прыцягваліся і студэнты), збіралі для беспрытульных дзяцей рэчы і прадукты, а таксама даволі вялікія грашовыя сродкі, працавалі ў створаных для іх сталовых, дзіцячых дамах (таксама разам са студэнтамі), камісіях і сацыяльнай інспекцыі [1, л. 45; 2; 3]. Камсамол удзельнічаў у тыднях дзіцяці, шэфстваваў над дзіцячымі дамамі і клубамі [4, л. 21–105; 5, л. 3; 6, л. 55]. Да кожнага дзіцячага дома быў прымацаваны камсамолец, які наведваў яго 2–3 разы на тыдзень для заняткаў з дзецьмі і дапамогі ў вырашэнні іх надзённых праблем [7, л. 10].

Калі ў пачатку 1920-х гг. КСМБ з-за дрэннага становішча маладых рабочых фактычна не займаўся барацьбой з безнаглядасцю дзяцей і падлеткаў, то ў 1923 г. разам з органамі Народнага камісарыята асветы ССРБ і іншых зацікаўленых ведамстваў пачаў надаваць гэтаму больш увагі. У пачатку года саюз вёў працу ў 6 дзіцячых дамах (у адным з іх нават была створана камсамольская ячэйка ў складзе 40 чалавек), а ў снежні 1923 г. прадстаўнікі яго ЦК і “Юнага Спартака” ўдзельнічалі ў працы Лігі дапамогі дзецям [8, л. 135; 9, л. 5; 10, л. 53].

У 1924 г. ЛКСМБ наладзіў сувязь з камісіямі ЦВК БССР па барацьбе з беспрытульнасцю і па прадастаўленні ільгот, а таксама ўдзельнічаў у барацьбе з дарагоўляй праз прадстаўніцтва ў адпаведных раённых камісіях [11, л. 20, 76; 12, л. 28].

© Даніловіч В.В., 2015

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Безнаглядныя падлеткі, спекулюючыя юнакі і дзяўчыны дакладна ўлічваліся і кантраляваліся праз эканамічныя аддзелы паветтаркамаў камсамола, пераводзіліся пад апеку аддзелаў сацыяльнага забеспячэння, накіроўваліся ў школы, працоўныя арцелі і атрады [13, л. 31; 14, л. 38].

У кастрычніку 1927 г. быў праведзены ўсесаюзны камсамольскі суботнік, у якім актыўны ўдзел прыняў ЛКСМБ. Сабраныя сродкі былі накіраваны на вырашэнне актуальных сацыяльна-эканамічных праблем, у тым ліку на барацьбу з дзіцячай і падлеткавай беспрытульнасцю [15; 16]. Аднак у 1928 г. удзел камсамола ў барацьбе з безнагляднасцю (за выключэннем аднаго праведзенага суботніка) заставаўся нездавальняючым [17, л. 182; 18, л. 23]. Да таго ж былі выпадкі, калі раённыя камітэты КП(б)Б затрымлівалі для сваіх патрэб грошы, сабраныя камсамольцамі ў час суботніка на карысць беспрытульных [17, л. 308]. Усё гэта сведчыць аб дэфіцыце фінансавых сродкаў у краіне ў той час і як вынік непрыярытэтнасці для мясцовага кіраўніцтва барацьбы з безнагляднасцю. Толькі ў снежні 1929 г. сродкі, сабраныя ў выніку рэспубліканскага камсамольскага суботніка па барацьбе з ёй, былі накіраваны на адкрыццё 1-га ўсебеларускага дому для беспрытульных імя ЛКСМБ у Бабруйску [19, л. 234].

Дзяржава надавала шмат увагі працаўладкаванню безнаглядных падлеткаў. Выхаванцы дзіцячых дамоў, якія дасягнулі 16 гадоў і не паступілі ў навучальныя ўстановы, накіроўваліся на працу на прадпрыемствы, у кааператыўныя аб’яднанні і саўгасы. Гэтаму спрыялі пастановы СНК БССР аб нормах працы і броні для падлеткаў 15, 16 і 17 гадоў на прадпрыемствах усіх формаў уласнасці [20–29]. У выніку на працягу 1920-х гг. тысячы выхаванцаў дзіцячых дамоў прыйшлі на вытворчасць [30, л. 50; 31, л. 97].

Аднак і камсамол Савецкай Беларусі быў непазбаўлены ад асацыяльных з’яў. У 1920-я гг. сярод яго членаў (як з кіруючага камсамольскага апарату, так і шэраговых) былі тыя, хто імкнуўся да асабістай карысці і выгады, што прыводзіла да правапарушэнняў і злачынстваў [9, л. 82, 87; 14, л. 25; 32, л. 8; 33, л. 39; 34, л. 65; 35, л. 4; 36, л. 15; 37, л. 26; 38, л. 254, 324–327; 39, л. 21; 40, л. 13; 41, л. 1, 26, 31, 48; 42, л. 6; 43, л. 2; 44, л. 44; 45, л. 62; 46, л. 8–11; 47, л. 136; 48, с. 6]. Меўся ў саюзе і непатрэбны бюракратызм [49, л. 36; 50, л. 83; 51, л. 217; 52, л. 1; 53, л. 57; 54, л. 1].

Сярод камсамольцаў адзначаліся выпадкі парушэння дысцыпліны і камсамольскай этыкі, самагонакурэння, п’янства, хуліганства і распусты [11, л. 59, 109; 17, л. 89; 33, л. 40; 36, л. 18; 37, л. 24; 40, л. 12, 15; 41, л. 35, 46, 53–54, 69–70, 78; 42, л. 7, 64–65; 43, л. 1, 4; 48, с. 32–33; 50, л. 48, 103, 140; 51, л. 213; 55, л. 27; 56, л. 4; 57, л. 162; 58, л. 1а, 3, 39; 59, л. 6; 60, л. 22; 61, л. 115; 62, л. 15; 63, л. 142; 64, л. 43; 65].

У камсамоле меліся трэнні паміж хлопцамі і дзяўчынамі [41, л. 58; 66, л. 17], вясковымі і гарадскімі камсамольцамі [41, л. 48, 55, 75; 67, л. 12; 68, л. 79; 69, л. 20], а на вёсцы – паміж беднякамі і серадняками [44, л. 448; 68, л. 191; 70, л. 65].

Аднак усе падобныя з’явы мелі месца і сярод несаюзнай моладзі Савецкай Беларусі.

Так, асобныя маладыя людзі звярталіся ў Рабоча-сялянскую інспекцыю (РСІ) са скаргамі дзеля вырашэння асабістых карысных патрэб [71, л. 110].

Шмат юнакоў і дзяўчын займаліся спекуляцыяй. Гэта з’ява была асабліва пашырана сярод яўрэйскага юнацтва [72, л. 7; 73, л. 5; 74, л. 2].

Сярод вялікай колькасці моладзі былі распаўсюджаны п’янства, хуліганства, распуста і эканамічныя злачынствы [18, л. 4; 36, л. 3, 7; 37, л. 40; 67, л. 72–73; 68,

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

л. 128; 70, л. 66; 75, л. 31; 76, л. 21; 77, л. 1048; 78; 79, л. 163; 80, л. 2; 81, л. 8; 82, л. 83; 83, л. 587; 84, л. 7; 85, л. 3; 86, с. 198].

Толькі з 1 кастрычніка 1925 г. па 1 кастрычніка 1926 г. у БССР было зарэгістравана 4136 выпадкаў хуліганства, з іх 47,8 % прыпадала на маладых людзей ва ўзросце да 24 гадоў [70, л. 76]. Юныя хуліганы былі і ў горадзе, і на вёсцы. Іх шайкі п'янстравалі, учынялі бойкі, здзяйснялі набегі на клубы, грамілі дамы адпачынку.

Вясковае хуліганства было найбольш распаўсюджана восенню і зімой, у вольны ад палявых прац час, а таксама ў дні рэлігійных свят і нядзелі, калі п'янства заканчвалася бойкамі. Таксама рэдка абыходзіліся без здарэнняў вяселлі, маладзёжныя вячоркі і пасядзелкі [87, л. 5; 88, л. 5–7].

Гарадское ж хуліганства моладзі было круглагадовым [89, л. 13; 90, л. 163; 91, с. 112]. Росту асацыяльных з'яў сярод маладога пакалення ў гарадах спрыяла тое, што юнакам і дзяўчынам не было куды дзяваць энергію. Адсутнічалі спартыўныя пляцоўкі, былі дрэнна абсталяваны клубы. Дзейнасці юнацкіх секцый пры агульных прафесійных клубах не надавалася належнай увагі. У выніку моладзь ці п'янствавала, ці хуліганіла [79, Спр. 274. л. 163–164; 86, с. 190, 312].

Сярод дзяўчын у гарадах, мястэчках і вёсках мела месца прастытуцыя з-за безнагляднасці, беспрацоўя, матэрыяльнай незабяспечанасці і непадрыхтаванасці да стваральнай працы [92, л. 54; 93, л. 69; 94, л. 157; 95, л. 30; 96, л. 46; 97, с. 298; 98, л. 5; 99, с. 141–142].

У цяжкім сацыяльным становішчы апыналіся маладыя людзі, якія вызваляліся з устаноў папраўчага выхавання, бо грамадства ставілася да іх падазрона і ва ўмовах беспрацоўя ім цяжка было знайсці працу [99, с. 164–165].

Дзяржава выкарыстоўвала комплекс практычных і прафілактычных мер для змяншэння злачыннасці і п'янства сярод юнага пакалення. Прымаліся адпаведныя пастановы ўрада БССР (аднак продаж гарэлкі асобам ва ўзросце да 16 гадоў быў забаронены толькі 27 сакавіка 1926 г.); ствараліся маладзёжныя гурткі і курсы па вывучэнні заканадаўства, вучэбна-працоўныя школы; выдаваліся артыкулы ў друку, серыі навукова-папулярных брашур; адкрываліся клубы і спартыўныя пляцоўкі для развіцця фізкультурнага руху сярод юнацтва; пашыралася сетка, паляпшалася абсталяванне і ўзмацнялася выхаваўчая праца культурна-асветных устаноў [79, л. 163; 99, с. 143–144; 100; 101, с. 39; 102; 103; 104].

Нягледзячы на гэта злачыннасць сярод юнакоў і дзяўчын расла аж да 1926 г. і заставалася на даволі высокім узроўні да канца 1920-х гг. Толькі з 1927 г., з разгортваннем індустрыялізацыі, пачалося зніжэнне асацыяльных з'яў сярод моладзі БССР [105, л. 486]. У выніку к канцу 1920-х гг. колькасць маладзёжных правапарушэнняў знізілася. Так, напрыклад, калі ў Віцебскай акрузе ў 1926 г. юнацкае хуліганства складала 18% ад усіх правапарушэнняў, то ў 1929 г. – 10% [106, л. 33].

Дзякуючы захадам дзяржавы і грамадства, большасць маладых правапарушальнікаў станавіліся на шлях выпраўлення і знаходзілі сваё месца ў жыцці [99, с. 166–168].

Юнакі і дзяўчыны таксама ўдзельнічалі ў барацьбе з беззаконнасцю і бюракратызмам [51, л. 203; 83, л. 587]. Часта з гэтай мэтай выкарыстоўваліся звароты ў РСІ [107, л. 30; 108, л. 14–17; 109, л. 177–179; 110, л. 39, 42; 111, с. 30–31].

Барацьба з бюракратызмам, паператворчасцю, непатрэбнымі пасяджэннямі за жывую практычную справу сталі характэрнымі рысамі дзейнасці многіх камсамольскіх арганізацый і камсамольскага друку Савецкай Беларусі [17, л. 136;

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

112, л. 36; 113, с. 115], хаця часам апублікаваныя ў камсамольскіх выданнях факты былі дробнымі і недастаткова праверанымі [114, л. 195].

Камсамол удзельнічаў у працы па скарачэнні кіраўнічага апарату і эканоміі сродкаў. Аднак боязь скарачэння ў выніку рацыяналізацыі прытупляла ў некаторай часткі камсамольцаў актыўнасць у барацьбе з бюракратызмам [17, л. 61; 115, л. 8].

У пачатку 1920-х гг. камсамол абвясціў непрымірымую вайну п'янству. Напрыклад, камсамольцы Барысава выпусцілі ў снежні 1922 г. спецыяльную лістоўку з заклікам да ўсіх рабочых уключыцца ў барацьбу з алкагалізмам, арганізавалі шэраг лекцый і гутарак урачоў аб шкодзе п'янства і ў выніку дамагліся рэзкага скарачэння ўжывання моладдзю спіртных напояў [113, с. 116]. Нягледзячы на гэта, праблема захоўвалася, і ў 1928 г. увага ЛКСМБ да антыалкагольнай прапаганды і барацьбы з п'янствам лічылася недастатковай [116, л. 51].

З канца 1924 г. пры ЦК камсамола БССР дзейнічала дысцыплінарная камісія [66, л. 22; 117, л. 9], а з 1925 г. – канфліктная камісія (КК), якая акрамя вырашэння канфліктаў змагалася з адмоўнымі з'явамі ў арганізацыі, у выхаваўчых мэтах праводзіла паказальныя суды. Усе рашэнні гэтых камісій зацвярджаліся сакратарыятам і Бюро ЦК ЛКСМБ [68, л. 16].

Сродкам барацьбы з адмоўнымі з'явамі сярод камсамольцаў з'яўлялася пазбаўленне адказных пасад і выключэнне з саюза [38, л. 328; 58, л. 1а]. Напрыклад, у 1925 г. сярод прычын выключэння з камсамола ў Савецкай Беларусі найбольшую колькасць складалі хуліганствы, п'янства і крадзяжы [118, л. 2], а частка камсамольцаў была выключана нават за бандытызм [41, л. 8].

Разам з тым, барацьба з адмоўнымі з'явамі ў ЛКСМБ лічылася недастатковай [119, л. 128; 120, л. 129] і шырока разгарнулася толькі ў 1930 г. [121, л. 63].

Камсамольцы прымацоўваліся да сталага ўдзелу ў працы бюро скаргаў РСІ (расследаванне і прапрацоўка скаргаў); моладзь прыцягвалася для барацьбы з бюракратызмам праз секцыі і камітэты гарсаветаў і сельсаветаў. З 1927 г. для дапамогі РСІ па ініцыятыве камсамола сярод маладога пакалення пачаў развівацца дабраахвотны рух пад назвай "Атрадаў лёгкай кавалерыі". Аднак масавым ён стаў толькі з 1928 г. [114, л. 199; 122, л. 45; 123, л. 97].

Бюро ЦК ЛКСМБ 10 лютага 1928 г. прыняло пастанову аб удзеле ў рацыяналізацыі савецкага апарату і барацьбе з бюракратызмам, якая адыграла важную ролю ў развіцці руху "лёгкай кавалерыі", атрады і групы якой фарміраваліся з камсамольскіх актывістаў і аказвалі вялікую дапамогу органам партыйна-дзяржаўнага кантролю (Цэнтральнай кантрольнай камісіі (ЦКК) КП(б)Б і РСІ) у выяўленні фактаў бесгаспадарчасці, бюракратызму, валакіты, разбазарвання дзяржаўных сродкаў і каштоўнасцяў. Пры гэтым рэкамендавалася прыцягваць у групы "лёгкай кавалерыі" несаюзную моладзь з ліку рабочых, батракоў і беднякоў [113, с. 155].

Аднак кіраўніцтва гэтым рухам з боку камсамола і РСІ было наладжана неадразу [58, л. 3; 120, л. 129; 124, л. 24, 26; 125, л. 23]. Так, у шэрагу райкамаў ЛКСМБ не разумелі яго сутнасці. Камсамольцы нават шукалі коней для "лёгкай кавалерыі" і звярталіся з падобнымі запытамі ў рэдакцыю "Чырвонай зьмены" [126, л. 10].

У групах "лёгкай кавалерыі" ў большасці выпадкаў актыўна дзейнічала толькі невялікае ядро іх членаў. Частка груп слаба ўскрывала недахопы, а ў асобных выпадках абмяжоўвалася голай канстатацыяй фактаў. Часам парушаўся дабраахвотны прынцып арганізацыі "лёгкай кавалерыі". Слаба быў пастаўлены ўлік яе працы. Працяглы час адсутнічаў абмен вопытам працы паміж групамі (толькі ў пачатку вясны 1930 г. адбыўся першы злёт "лёгкай кавалерыі" БССР) [127, л. 1, 8].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Да матэрыялаў і прапаноў "лёгкай кавалерыі" часам не было дастатковай увагі і рэагавання з боку гаспадарчых, прафсаюзных і савецкіх органаў, што глушыла ініцыятыву [117, л. 132]. Так, у 1929 г. "Чырвоная зьмена" нерэгулярна выпускала лісток "лёгкай кавалерыі", слаба ішла рэакцыя і расследаванне заметак [19, л. 205].

Усё гэта прывяло да распаду вялікай колькасці груп і атрадаў "лёгкай кавалерыі" (асабліва ў 1929 г.), шматлікіх выпадкаў скажэння прынцыпаў яе працы: адрыў ад мас, нізкая самадзейнасць, частае праходжанне міма асноўных гаспадарча-палітычных мерапрыемстваў кампартыі і камсамола (барацьба за прамфінплан на грунце спаборніцтва, калектывізацыя сельскай гаспадаркі, чыстка савецкага апарату і інш.) [117, л. 130].

Разам з тым, у 1930 г. былі не рэалізаваны пастановы ЦК і КК ВКП(б), Усесаюзнай нарады сакратароў парткалегій аб перабудове працы канфліктных камісій ЛКСМБ. Іх арганізацыйная пабудова, змест і тэмпы працы не адпавядалі і значна адставалі ад сучасных задач. КК працавалі замкнёна кабінетным парадкам і проста фіксавалі пастановы ячэек і камітэтаў саюза. Кіраўніцтва імі з боку кампартыі адсутнічала [54, л. 1–2].

Таму былі ўстаноўлены дакладныя правілы арганізацыі працы канфліктных камісій камсамола БССР.

Пленум КК ЦК ЛКСМБ выбіраўся на пленуме ЦК саюза і з'яўляўся вышэйшым органам ЦКК ЛКСМБ, які склікаўся па пастанове Прэзідыуму ЦКК саюза не радзей 1 раза ў 4 месяцы і падпарадкоўваўся ЦК ЛКСМБ. Пленум ЦКК саюза заслухоўваў і зацвярджаў справаздачы Прэзідыуму ЦКК і яго камсамольскай калегіі, выбіраў Прэзідыум ЦКК і яго старшыню, а таксама старшыню камсамольскай калегіі ЦКК ЛКСМБ. Прэзідыум ЦКК саюза выбіраўся ў складзе 11 асоб і склікаўся не радзей 1 раза ў 2 тыдні. Быў створаны інстытут камсамольскіх следчых (павінны былі мець не менш 4 год камсамольскага стажу і 4 гады вытворчага, з'яўляцца членамі ці кандыдатамі КП(б)Б) і засядацеляў (павінны былі мець не менш 3 гадоў камсамольскага і 3 гады вытворчага стажу, з'яўляцца членамі ці кандыдатамі КП(б)Б), а таксама групы добраахвотнікаў-ініцыятараў у колькасці 100 чалавек пры Прэзідыуме ЦКК ЛКСМБ. Камсамольскія следчыя і засядацелі выбіраліся на агульных сходах ячэек тэрмінам на 1 год. Спіс ячэек, ад якіх выбіраліся следчыя і засядацелі вызначаў Прэзідыум ЦКК саюза разам з камітэтамі ЛКСМБ. Следчыя і засядацелі кожныя 3 месяцы давалі справаздачы камсамольскім сходам, ячэек, якія іх вылучылі [54, л. 14].

З добраахвотнікаў і следчых складаліся ініцыятыўныя групы: 1) па барацьбе за чыстату ленінскай лініі ў саюзе; 2) па хваравітых з'явах у сацыялістычным будаўніцтве (сектары: а) вытворчы, б) сельска-гаспадарчы, в) транспартны); 3) па хваравітых з'явах у нацыянальным пытанні і стане інтэрнацыянальнага выхавання; 4) па хваробах быту і этыкі ў ЛКСМБ; 5) па стану крытыкі, самакрытыкі і ўнутрысаюзнай дэмакратыі; 6) па хваробах росту арганізацыі; 7) па стану антырэлігійнай працы ў ЛКСМБ; 8) па стану камсамольскай дысцыпліны; 9) па хваравітых з'явах у асяроддзі вайсковага камсамолу і сярод камсамольцаў на вайсковай працы; 10) інструктарская (выязжала на месцы для расследавання спраў і абследавання арганізацый). Пры Прэзідыуме ЦКК ЛКСМБ стваралася камсамольская калегія, якая збіралася не радзей 1 разу ў дэкаду. Пры разглядзе спраў на калегіі павінны былі прысутнічаць не менш 3 яе членаў, 2 засядацеляў і 1 следчага-рабкора. Пры адсутнасці аднагалосся па разглядаемым пытанні вырашэнне справы пераносілася на Прэзідыум ЦКК саюза. Для падрыхтоўкі да

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

разгляду канфліктных спраў на калегіі пры ёй ствараліся камсамольскія тройкі, у якіх па чарзе працавалі ўсе члены ЦКК ЛКСМБ пры абавязковым старшынстве аднаго з іх. На пасяджэнні троек павінны былі прысутнічаць неменш 1 засядацеля і 1 следчага. На пасяджэнні калегіі абавязкова выклікаліся камсамольцы, чые справы разглядаліся (калі яны двойчы не з'яўляліся, іх справа разглядалася завочна) [54, л. 15].

Камсамольскія тройкі вывучалі хваравітыя з'явы па заданні Прэзідыума ЦКК саюза. Групы "лёгкай кавалерыі" ўвесь матэрыял па хваравітых з'явах накіроўвалі ў ЦКК ЛКСМБ, якая магла праз ЦК саюза даручаць ім расследаванне тых ці іншых спраў. Прэзідыум і камсамольская калегія ЦКК ЛКСМБ непасрэдна падпарадкоўваліся сакратарыяту ЦК саюза. ЦКК ЛКСМБ працавала пад сталым кіраўніцтвам і ў цесным кантакце з ЦКК КП(б)Б, у якой мела свайго прадстаўніка. На выяздных пасяджэннях камсамольскай калегіі ці Прэзідыума ЦКК саюза павінны былі прысутнічаць не менш 3 членаў ЦКК, 1 следчага і 1 засядацеля [54, л. 16].

Прэзідыумы раённых і гарадскіх КК выбіраліся на пленумах РК і ГК ЛКСМБ (у вясковых раёнах у складзе 11-13 асоб, а ў гарадскіх – 17-19 асоб). Камсамольскі стаж выбіраемых павінен быў быць у вясковых раёнах – няменш 2 гадоў, у гарадскіх – неменш 3 гадоў. Старшыня прэзідыўму гарадскіх КК павінен быў быць членам КП(б)Б і бюро ГК камсамола, а старшыня Прэзідыўму раённых КК – членам ці кандыдатам КП(б)Б і бюро РК ЛКСМБ. Пленумы раённых і гарадскіх КК збіраліся не радзей 1 раза ў 2 месяцы па пастанове прэзідыумаў КК, якія складаліся ў раённых КК з 3-5 асоб, а ў гарадскіх КК – з 5-7 асоб і збіраліся не радзей 1 раза ў дэкаду. Пры прэзідыумах раённых і гарадскіх КК ствараўся інстытут засядацеляў (5-7 асоб) і следчых (11-13 асоб) і групы ініцыятараў-дабраахвотнікаў у колькасці 20-50 чалавек. Следчыя і засядацелі выбіраліся на агульных сходах ячэяк саюза тэрмінам на паўгода. Кожныя 3 месяцы яны давалі справаздачы ячэйкам, якія іх выбралі. Спіс ячэяк, ад якіх яны выбіраліся, вызначаўся бюро РК ці ГК ЛКСМБ і прэзідыумам КК, пры якім ствараліся ініцыятыўныя групы: 1) па хваравітых з'явах у сацыяльным будаўніцтве; 3) па хваробных з'явах у быце, этыке і дысцыпліне; 4) па хваробах росту арганізацыі; 2) па барацьбе за чыстату ленінскай лініі ў камсамоле; 5) па стану крытыкі і самакрытыкі і ўнутрысаюзнай дэмакратыі; 6) інструктарская і інш. [54, л. 17].

Калі камсамольца выключалі з камсамола бюро ГК ці РК ЛКСМБ, выключэнне можна было абскардзіць толькі ў ЦКК саюза. Калі выклікаемы для разбору справы таварыш не з'яўляўся тройчы, то яго справа разглядалася завочна. Пасля атрымання спагнання апеляцыя падавалася на працягу 3 месяцаў. Для хутчэйшага разгляду спраў пры арганізацыях ЛКСМБ, якія налічвалі 300 членаў ствараліся КК з 3 асоб тэрмінам на паўгода. У меншых структурах саюза на агульных сходах выбіраліся следчыя таксама тэрмінам на паўгода. Пастановы КК пры арганізацыях абавязкова зацвярджаліся Прэзідыумамі гарадскіх ці раённых КК ЛКСМБ. КК падпарадкоўваліся бюро ГК і РК саюза. Пры гэтым раённыя КК ЛКСМБ пад кіраўніцтвам і ў цесным кантакце з раённымі КК РСІ, у якіх мелі сваіх прадстаўнікоў [54, л. 18].

Прадпрынятыя захады значна палепшылі і актывізавалі працу камсамольскіх кафліктных камісій.

У 1930-я гг. дзяржава працягвала прадпрымаць меры па барацьбе з дзіцячай і падлеткавай беспрытульнасцю, маладзёжнай злачыннасцю. На гэтыя мэты

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

выдаткоўваліся дадатковыя матэрыяльныя сродкі, узмацнялася і рабілася больш строгай заканадаўчая база [128, л. 37, 77–78, 101; 129, л. 10, 105; 130, л. 10, 13, 19; 131, с. 227–228]. Такія захады разам з ліквідацыяй беспрацоўя далі станоўчыя вынікі.

Прэзідыум ЦКК РСІ ўвязваў сваю дзейнасць з групамі "лёгкай кавалерыі" праз ЦК ЛКСМБ, якія ўвесь матэрыял па хваробных з'явах сярод камсамольцаў абавязкова накіроўвалі ў ЦКК саюза [132, л. 115].

Разам з тым, у 1930-я гг. адзначалася, што асабліва хваробнай справай у жыцці большасці камсамольскіх арганізацый БССР з'яўлялася маральна-бытавое разлажэнне часткі камсамольцаў (вельмі часта кіруючых работнікаў): сістэматычнае п'янства, хабары, растраты грамадскіх грошай, дэбошы і г.д. [133, л. 44; 134, л. 20–21; 135, л. 16, 19; 136, л. 137–138, 143–144, 146–147].

Пры гэтым зазначалася што ў 1931 г. заціхла праца "лёгкай кавалерыі" [137, л. 271] і КК ЦК ЛКСМБ не вяла сістэматычнай працы па вывучэнні і папярэджванні хваравітых з'яў [132, л. 108]. А ў 1934 г., напрыклад, саюз не вёў на месцах рашучай барацьбы з хуліганствам (асабліва ў Віцебску, Магілёве, Гомелі і Оршы) і іншымі асацыяльнымі з'явамі [138, л. 187, 353].

Аднак далёка не ўсё залежыла ад актыўнасці камсамола. Так, ЦК ЛКСМБ на працягу 1933 г. абследаваў становішча ў дзіцячых дамах і прапанаваў шэраг мер па яго паляпшэнні. Дакладная запіска была перададзена ЦК КП(б)Б, Народнаму камісарыяту асветы БССР і іншым зацікаўленым ведамствам і арганізацыям. Але ад іх не было атрымана ніякай рэакцыі, хаця дрэннае становішча ў дзіцячых дамах склалася з-за нездавальняючай працы камсамола, Народнага камісарыята асветы рэспублікі, прафсаюзаў і патрабавала неадкладнага выпраўлення [139, л. 60], што гаворыць аб пасіўнасці дзяржаўных структур у вырашэнні гэтай праблемы.

Разам з тым, часам дзейнасць груп "лёгкай кавалерыі" ажыццяўлялася супрацьпраўнымі метадамі, але гэта публічна асуджалася [140, л. 61].

Нягледзячы на ўсе хібы, з 1932 г. у БССР дзейнасць груп "лёгкай кавалерыі" атрымала шырокі размах. Праводзіліся яе раённыя злёты. Шырокае распаўсюджанне атрымалі ўсесаюзныя і рэспубліканскія рэйды "лёгкай кавалерыі", месячнікі праверкі. У цэлым за час сваёй дзейнасці яе групы аказалі істотную дапамогу ў барацьбе з бюракратызмам у кіруючым апараце, узняцці вытворчасці працы, паляпшэнні метадаў гаспадарання, праяўлялі шмат вынаходніцтва ў барацьбе з прагульшчыкамі, п'яніцамі, абібокамі і бракаробамі. Камсамольцы стваралі брыгады "сяброў станка", якія сачылі за захаваннем абсталявання і інструментаў, правяралі наладжанасць догляду механізмаў. У выніку, дзякуючы "лёгкай кавалерыі", удалося выкараніць абыякавасць у доглядзе за тэхнікай, што дазволіла зэканоміць сотні тысяч рублёў, лепш выкарыстоўваць абсталяванне і ўзняць вытворчасць працы. Групы "лёгкай кавалерыі" адыгралі значную ролю ў паляпшэнні ўліку ў сельскай гаспадарцы. Для заахвочвання іх дзейнасці выкарыстоўваліся спецыяльныя прэміяльныя фонды і прадастаўленне "лёгкім кавалерыстам" дарадчых мандатаў на з'езды саветаў [113, с. 155–156, 195; 117, л. 130; 124, л. 21; 127, л. 8; 138, л. 276, 305; 139, л. 12, 105; 141, л. 151; 142, л. 5, 21; 143, л. 284; 144, л. 2; 145, л. 1; 146, л. 38–39].

Такім чынам, найбольш актуальнай праблемай у 1920-я гг. з'яўлялася дзіцячая і падлеткавая беспрытульнасць. Калі спачатку камсамол з-за дрэннага становішча маладых рабочых фактычна не займаўся барацьбой з безнагляднасцю дзяцей і падлеткаў, то з 1923 г. разам з зацікаўленымі ведамствамі пачаў надаваць гэтаму больш увагі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Дзяржава імкнулася працаўладкаваць безнаглядных падлеткаў. З гэтай мэтай была створана адпаведная заканадаўчая база. Выхаванцы дзіцячых дамоў, якія не паступілі ў навучальныя ўстановы, накіроўваліся на працу на прадпрыемствы, у кааператыўныя аб'яднанні і саўгасы. У выніку на працягу 1920-х гг. тысячы выхаванцаў дзіцячых дамоў прыйшлі на вытворчасць.

Аднак і ў самім камсамоле Савецкай Беларусі адзначаліся асацыяльныя з'явы.

Разам з тым, усе падобныя з'явы ў значна большых памерах мелі месца і сярод несаюзнай моладзі Савецкай Беларусі. Таму дзяржава выкарыстоўвала комплекс практычных і прафілактычных мер для змяншэння асацыяльных з'яў сярод юнага пакалення.

Але дзейнасць дзяржавы і грамадства па абмежаванні злачыннасці сярод юнакоў і дзяўчын стрымлівалі ліберальнае заканадаўства, адсутнасць матэрыяльных сродкаў і наяўнасць беспрацоўя. Моладзь таксама ўдзельнічала ў барацьбе з беззаконнасцю і бюракратызмам.

З канца 1924 г. пры ЦК камсамола БССР дзейнічала дысцыплінарная камісія, а з 1925 г. – канфліктная камісія, якая акрамя вырашэння канфліктаў змагалася з адмоўнымі з'явамі ў арганізацыі, у выхаваўчых мэтах праводзіла паказальныя суды. Усе рашэнні гэтых камісій зацвярджаліся сакратарыятам і Бюро ЦК ЛКСМБ. Сродкам барацьбы з адмоўнымі з'явамі сярод камсамольцаў з'яўлялася пазбаўленне адказных пасад і выключэнне з саюза.

Апраўдалі сябе прымацаванне камсамольцаў для сталага ўдзелу ў працы бюро скаргаў РСІ; прыцягненне юнакоў і дзяўчын для барацьбы з бюракратызмам праз секцыі і камітэты гарсаветаў і сельсаветаў; добраахвотны рух маладога пакалення пад назвай “Атрадаў лёгкай кавалерыі”.

Аднак кіраўніцтва гэтым рухам з боку камсамола і РСІ было наладжана неадразу і якасць працы груп “лёгкай кавалерыі” працяглы час пакідала жадаць лепшага. Да матэрыялаў і прапаноў “лёгкай кавалерыі” часам не было дастатковай увагі і рэагавання з боку гаспадарчых, прафсаюзных і савецкіх органаў. Усё гэта прывяло да распаду вялікай колькасці груп і атрадаў “лёгкай кавалерыі” (асабліва ў 1929 г.).

Арганізацыйная пабудова, змест і тэмпы працы канфліктных камісій ЛКСМБ таксама доўгі час не адпавядалі пастаўленым задачам. КК працавалі замкнёна кабінетным парадкам і проста фіксавалі пастановы ячэек і камітэтаў саюза. Кіраўніцтва імі з боку кампартыі адсутнічала. Толькі ў 1931 г. былі ўстаноўлены дакладныя правілы арганізацыі працы канфліктных камісій камсамола БССР, што значна палепшыла і актывізавала іх працу.

Нягледзячы на ўсе хібы, з 1932 г. у БССР дзейнасць груп “лёгкай кавалерыі” атрымала шырокі размах. Для заахвочвання іх дзейнасці выкарыстоўваліся спецыяльныя прэміяльныя фонды і прадастаўленне “лёгкім кавалерыстам” дарадчых мандатаў на з'езды саветаў.

У цэлым за час сваёй дзейнасці групы “лёгкай кавалерыі” аказалі істотную дапамогу ў барацьбе з бюракратызмам у кіруючым апараце, узняцці вытворчасці працы, паляпшэнні метадаў гаспадарання, праяўлялі шмат вынаходніцтва ў барацьбе з прагульшчыкамі, п'яніцамі, абібокамі і бракаробамі.

Увогуле злачыннасць і асацыяльныя з'явы сярод камсамольцаў і моладзі значна зменшыліся (хоць цалкам і не зніклі) у 1930-я гг., калі было ліквідавана беспрацоўе, у дзяржавы з'явіліся дадатковыя матэрыяльныя сродкі, а заканадаўства стала больш строгім. Дзякуючы захадам дзяржавы і грамадства, большасць маладых правапарушальнікаў станавіліся на шлях выпраўлення і знаходзілі сваё месца ў жыцці.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## *СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ*


1. Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. – Ф. 60. Воп. 4. Спр. 1.
2. ***Коф.*** Как мы использовали каникулы / Коф // Красная молодёжь. – 1924. – № 2. – С. 140–141.
3. ***Кронин, Б.*** Комсомол и борьба с детской беспризорностью / Б. Кронин // Известия. – 1924. – 14 марта. – С. 5.
4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 157.
5. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 16.
6. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 18.
7. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 15.
8. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 19.
9. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 22.
10. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 25.
11. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 33.
12. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 49.
13. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 5.
14. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 11.
15. ***Савельев, К.*** Окажем помощь беспризорникам / К. Савельев // Савецкая Беларусь. – 1927. – 16 кастрычніка. – С. 4.
16. ***Чуброў, С.*** Дапамога дзецям / С. Чуброў // Чырвоная зьмена. – 1928. – 5 студзеня. – С. 4.
17. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 81.
18. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 355.
19. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 93.
20. О нормировании труда подростков: постановление СНК ССРБ, 10 сентября 1921 г. // Известия ЦИК ССРБ. – 1921. – № 19. – С. 2.
21. Об установлении предельного минимума количества подростков в предприятиях: постановление СНК БССР, 22 июля 1924 г. // Собрание узаконений и распоряжений Рабоче-крестьянского правительства БССР. – 1924. – № 14. – Ст. 123.
22. О дополнении постановления СНК БССР от 22 июля 1924 года “Об установлении предельного минимума количества подростков в предприятиях”: постановление СНК БССР, 11 февраля 1925 г. // Собрание узаконений и распоряжений Рабоче-крестьянского правительства БССР. – 1925. – № 9. – Ст. 87.
23. Об установлении количества подростков по отношению к взрослым рабочим в мелких предприятиях: постановление СНК БССР, 25 февраля 1925 г. // Собрание узаконений и распоряжений Рабоче-крестьянского правительства БССР. – 1925. – № 16. – Ст. 119.
24. Об утверждении инструкции к временным правилам об условиях применения подсобного наtмного труда в крестьянских хозяйствах: постановление СНК БССР, 12 августа 1925 г. // Собрание законов и распоряжений Рабоче-крестьянского правительства БССР. – 1925. – № 42. – Ст. 351.
25. Об ответственности нанимателей за нарушение временных правил от 18 апреля 1925 года об условиях применения подсобного наёмного труда в крестьянских хозяйствах и инструкции к этим правилам от 12 августа 1925 г.: постановление СНК БССР, 7 июля 1926 г. // Собрание законов и распоряжений Рабоче-крестьянского правительства БССР. – 1926. – № 30. – Ст. 113.
26. Об установлении норм брони подростков на строительных работах: постановление СНК БССР, 4 июня 1927 г. // Собрание законов и распоряжений Рабоче-крестьянского правительства БССР. – 1927. – № 28. – Ст. 137.
27. О нормах брони для подростков: постановление СНК БССР, 24 декабря 1928 г. // Собрание законов и распоряжений Рабоче-крестьянского правительства БССР. – 1928. – № 37. – Ст. 354.
28. Об изменении в кодексе законов о труде: постановление ЦИК и СНК БССР, 2 марта 1929 г. // Собрание законов и распоряжений Рабоче-крестьянского правительства БССР. – 1929. – № 10. – Пост. 51.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

29. Об изменении ст. 1 постановления о нормах брони для подростков: постановление СНК БССР, 14 декабря 1929 г. // Собрание законов и распоряжений Рабоче-крестьянского правительства БССР. – 1929. – № 45. – Пост. 275.
30. Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці (ДАМВ). – Ф. 320. Воп. 1. Спр. 303.
31. ДАМВ. – Ф. 333. Воп. 1. Спр. 100.
32. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 12.
33. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 24.
34. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 35.
35. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 42.
36. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 46.
37. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 54.
38. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 64.
39. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 66.
40. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 84.
41. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 121.
42. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 122.
43. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 123.
44. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 185.
45. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 188.
46. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 226.
47. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 423.
48. Рэзалюцыя III пленуму ЦК ЛКСМБ (люты 1929 г.). – Мінск : Выдавецтва "Чырвоная зьмена", 1929. – 64 с.
49. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 27.
50. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 53.
51. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 174.
52. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 204.
53. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 358.
54. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 554.
55. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 41.
56. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 59.
57. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 62.
58. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 80.
59. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 88.
60. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 31.
61. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 74.
62. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 146.
63. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 448.
64. НАРБ. – Ф. 101. Воп. 2. Спр. 301.
65. ***Саковіч, П.*** Супраць алкаголю і "алкагольствуючых" / П. Саковіч // Чырвоная зьмена. – 1928. – 9 верасня. – С. 1.
66. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 37.
67. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 44.
68. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 49.
69. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 133.
70. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 287.
71. НАРБ. – Ф. 101. Воп. 2. Спр. 95.
72. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 6.
73. Расійскі дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі (РДАСПГ). – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 30.
74. РДАСПГ. – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 90.
75. Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці (ДАГАГВ). – Ф. 3723. Воп. 1. Спр. 19.
76. ДАГАГВ. – Ф. 3723. Воп. 1. Спр. 9.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

77. Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці (ДАГАМгВ). – Ф. 6577. Воп. 1. Спр. 21.
78. ***Лебина, Н.*** "Лёнька Пантелеев – сыщиков гроза...": преступность в советском обществе 20–30-х годов / Н. Лебина // Родина. – 1995. – № 1. – С. 58–63.
79. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 7. Спр. 274.
80. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 7.
81. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 13.
82. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 45.
83. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 64а.
84. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 100.
85. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 12.
86. Х-й с'езд Коммунистической партии (большевиков) Белоруссии, 3–10 января 1927 г.: стенографический отчёт. – Минск : Белорусское государственное издательство, 1927. – 448 с.
87. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Ф. 2351. Воп. 2. Спр. 7.
88. ДАМВ. – Ф. 321. Воп. 1. Спр. 112.
89. ДАВВ. – Ф. 10051. Воп. 1. Спр. 608.
90. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 7. Спр. 33.
91. ***Рожков, А. Ю.*** Молодой человек 20-х годов: протест и девиантное поведение / А. Ю. Рожков // Социс. – 1999. – № 7. – С. 107–114.
92. ДАГАМгВ. – Ф. 6573. Воп. 1. Спр. 334.
93. ДАГАМгВ. – Ф. 6577. Воп. 1. Спр. 137.
94. ДАГАМгВ. – Ф. 6577. Воп. 1. Спр. 141.
95. ДАМВ. – Ф. 12п. Воп. 1. Спр. 1000.
96. ДАМВ. – Ф. 1193. Воп. 1. Спр. 14.
97. ***Дулов, А. Н.*** Проституция и борьба сней в Витебске в первые годы Советской власти / А. Н. Дулов // Женщина. Образование. Демократия : материалы 3-й Междунар. междисциплинар. науч.-практ. конф. (8–9 декабря 2000 г.). – Минск : ООО "ЭНВИЛА – М", 2001. – С. 297–299.
98. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 799.
99. ***Соловьянов, А. П.*** Социальная защита несовершеннолетних в БССР (1921 – 1930 гг.) / А. П. Соловьянов. – Минск : Беларуская навука, 2013. – 203 с.
100. ***Григорьев, А. Д.*** Борьба с преступностью несовершеннолетних и другими проявлениями социальной патологии в первые годы Советской власти на Беларуси / А. Д. Григорьев // Информационный научно-методический бюллетень Комиссии по исполнению наказаний МВД Республики Беларусь. – 2000. – № 9. – С. 70–76.
101. ***Нясьцюк, М.*** Больш увагі пытаньням алкагалізму і барацьбы з ім у рабоце школы / М. Нясьцюк // Асьвета. – 1929. – № 8. – С. 38–41.
102. О регулировании продажи 40$^0$ хлебного вина : постановление ЦИК и СНК БССР, 27 марта 1926 г. // Собрание узаконений и распоряжений Рабоче-крестьянского правительства БССР. – 1926. – № 23. – Ст. 87.
103. О мерах борьбы с хулиганством: постановление СНК БССР, 29 декабря 1926 г. // Собрание узаконений и распоряжений Рабоче-крестьянского правительства БССР. – 1927. – № 3. – Ст. 15.
104. О мероприятиях по борьбе с алкоголизмом: постановление СНК БССР, 23 августа 1929 г. // Собрание узаконений и распоряжений Рабоче-крестьянского правительства БССР. – 1929. – № 32. – Ст. 188.
105. ДАМВ. – Ф. 12п. Воп. 1. Спр. 174.
106. ДАВВ. – Ф. 10051. Воп. 1. Спр. 796.
107. НАРБ. – Ф. 101. Воп. 2. Спр. 19.
108. НАРБ. – Ф. 101. Воп. 2. Спр. 63.
109. НАРБ. – Ф. 101. Воп. 2. Спр. 68а.
110. НАРБ. – Ф. 101. Воп. 2. Спр. 79.
111. ***Юркевіч, Н. У.*** "Прашу Рабоча-сялянскую інспекцыю...": скаргі і заявы грамадзян Беларусі (1920–1930-я гг.) / Н. У. Юркевіч. – Мінск : І. П. Логвінаў, 2009. – 216 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

112. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 27.
113. Очерки истории Ленинского комсомола Белоруссии. – Минск : Беларусь, 1975. – 536 с.
114. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 71а.
115. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 177.
116. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 85.
117. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 101.
118. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 103.
119. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 396.
120. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 397.
121. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 523.
122. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 301.
123. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 465.
124. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 89.
125. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 510.
126. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 388.
127. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 524.
128. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі (ДАРФ). – Ф. Р.5207. Воп. 1. Спр. 889.
129. ДАРФ. – Ф. Р.5207. Воп. 1. Спр. 485.
130. ДАРФ. – Ф. Р.5207. Воп. 1. Спр. 908.
131. КПСС о комсомоле и молодёжи. Сборник резолюций, решений съездов, конференций партии, постановлений ЦК КПСС и других партийных документов (1917–1961 гг.). – Москва : Молодая гвардия, 1962. – 397 с.
132. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 126.
133. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 147в.
134. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 295.
135. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 591.
136. РДАСПГ. – Ф. М-1. Воп. 23. Спр. 1294.
137. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 110.
138. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 136.
139. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 599.
140. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 606.
141. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 134.
142. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 137.
143. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 424.
144. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 607.
145. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 608.
146. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 611.

Паступіў у рэдакцыю 04.03.2015 г.
Кантакты: Danilovich_V@Mail.ru (Данилович Вячеслав Викторович)

**Danilovich V.V. THE EFFECT OF ANTI-SOCIAL PHENOMENA ON THE YOUTH OF THE SOVIET BELARUS AND FIGHT AGAINST IT (1921–1939).**

*The article investigates the problem of the influence of anti-social phenomena on the youth of the Soviet Belarus in the 1920–1930s and the fight of the state and society against that influence. It is alleged that the state used a set of practical and preventive measures to reduce anti-social phenomena among the young generation, including the members of the Komsomol. The boys and girls also took part in combating antisocial behaviour. Since 1932 such youth activities became widespread in the BSSR. In general antisocial phenomena among the youth and Komsomol decreased significantly in the 1930s when unemployment was eliminated and the state had sufficient funds to support the younger generation, and the legislation became more stringent.*

**Key words:** Soviet Belarus, youth, antisocial phenomena, policy of the Communist Party, the activities of the Young Communist League.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова